9(С3)
Ж 949
полк2

*А. П. Жытко*

# ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ перыяду капіталізму. 1861 – 1914 гг.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. П. Жытко**

# ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ. 1861 — 1914 гг.

*Манаграфія*

1629152

Бібліятэка
БДПУ імя М.Танка

Мінск 2003

УДК 947.6
ББК 63.3(2)5(4Бел)
Ж11

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Навуковы рэдактар*
В. М. Фамін, доктар гістарычных навук, прафесар

*Рэцэнзенты:*
У. І. Навіцкі, доктар гістарычных навук, прафесар;
З. В. Шыбека, доктар гістарычных навук, прафесар

**Жытко А. П.**
Ж11 Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг.: Манагр.— Мн.: БДПУ, 2003.— 233 с.
ISBN 985-435-556-X

У манаграфіі ўпершыню ў беларускай гістарычнай навуцы комплексна даследуецца гісторыя дваранства Беларусі ў перыяд станаўлення і развіцця капіталістычных адносін. Аналізуюцца разрады, крыніцы папаўнення вышэйшага саслоўя, дынаміка яго колькаснага, веравызнальнага і нацыянальнага складу, адукацыйны ўзровень. Значнае месца займае разгляд ролі дваранства ў развіцці эканомікі краю. Даследуецца дваранскае землеўладанне, развіццё земляробства, жывёлагадоўчай і прамысловай вытворчасці. Значнае месца ўдзяляецца аналізу палітыкі царызму ў дачыненні да карпаратыўнай арганізацыі вышэйшага саслоўя Беларусі і яго дзяржаўнай службы.

Прызначаецца навукоўцам, настаўнікам, студэнтам, шырокаму колу чытачоў.

УДК 947.6
ББК 63.3(2)5(4Бел)

ISBN 985-435-556-X

© А. П. Жытко, 2003
© ВВЦ БДПУ, 2003

## ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ............ 4

ГЛАВА 1. ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ І КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ ............ 5
1.1. Гістарыяграфія праблемы ............ 5
1.2. Крыніцазнаўчы аналіз ............ 17

ГЛАВА 2. ДЫНАМІКА КОЛЬКАСНАГА І ЎНУТРЫСАСЛОЎНАГА СКЛАДУ ДВАРАНСТВА ............ 20
2.1. Паходжанне і крыніцы папаўнення дваранства ў Беларусі ............ 20
2.2. Дынаміка колькаснага складу дваранства ............ 41
2.3. Якасныя змяненні ў дваранскім саслоўі Беларусі ............ 57

*ГЛАВА 3.* ГАСПАДАРЧА-ЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ ............ 16
3.1. Дваранскае землеўладанне ............ 16
3.2. Земляробства ............ 54
3.3. Дваранска-памешчыцкая жывёлагадоўля ............ 61
3.4. Дваранскае прамысловае прадпрымальніцтва і гандаль лесам ............ 172
3.5. Унутрысаслоўнае расслаенне дваранства ............ 192

ГЛАВА 4 АДНОСІНЫ ЦАРЫЗМУ ДА КАРПАРАТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫШЭЙШАГА САСЛОЎЯ. ДВАРАНСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ СЛУЖБА.. 202
4.1. Лёс карпаратыўнай арганізацыі дваранства Беларусі ............ 202
4.2. Дзяржаўная служба дваранства ............ 212

ЗАКЛЮЧЭННЕ ............ 221

ДАДАТКІ ............ 229
*Дадатак 1.* Табліца расійскіх чыноў ............ 229
*Дадатак 2.* Тытулаваныя землеўласнікі Беларусі ............ 230

# УВОДЗІНЫ

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства, з пераходам яго да рыначных эканамічных адносін, якія парываюць з уяўнай сацыялістычнай маёмаснай справядлівасцю і фарміруюць сацыяльную градацыю насельніцтва і адпаведную ментальнасць, зварот гісторыкаў да працэсаў станаўлення і развіцця капіталізму мае не толькі навукова-тэарэтычнае, але і практычнае значэнне.

Савецкая гістарычная навука, у тым ліку і беларуская, якая абапіралася на марксісцка-ленінскую метадалогію, прызнавала некаторыя станоўчыя моманты рыначнай эканомікі (развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, фарміраванне буржуазіі і рабочага класу і г. д.), але, кіруючыся асноўнымі палажэннямі ленінскай дактрыны, савецкія гісторыкі даказвалі, што на этапе імперыялізму капіталізм вычарпаў сябе як эканамічная сістэма і тым самым сфарміраваў свайго магільшчыка — пралетарыят. Класавая барацьба (рухавік прагрэсу ў антаганістычным грамадстве) рабочага класа з буржуазіяй у адпаведнасці з марксісцка-ленінскай канцэпцыяй перманентна вяла да ліквідацыі рыначных адносін, улады буржуазіі і ўсталявання сацыялістычна-размеркавальнай сістэмы як больш прагрэсіўнай і сацыяльна справядлівай.

Зразумела, што пры такім падыходзе дваранскаму саслоўю, якое з'яўлялася прадуктам феадальнай эпохі, адводзілася толькі адмоўная роля. У савецкай гістарыяграфіі вышэйшае саслоўе выступала як носьбіт прыгонніцкіх перажыткаў, дзякуючы якому манархія праіснавала да 1917 г. Пры гэтым амаль не рабілася спроб высветліць яго ролю ў ацыяльна-эканамічным і культурным развіцці краіны, паказаць нацыянальныя асаблівасці дваранства розных рэгіёнаў імперыі, у тым ліку Беларусі. Хаця больш уважлівы падыход да беларускага набілітэту, які ў сваёй большасці быў каталіцкага веравызнання, паказвае, што ён з часоў падзелаў Рэчы Паспалітай знаходзіўся ў апазіцыі да самадзяржаўя. Практычна да сярэдзіны 50-х гадоў XX ст. гісторыя дваранства, як і іншых "эксплуататарскіх класаў", у савецкай гістарыяграфіі не вывучалася. Гэтая праблематыка, як заўважыў М.І. Паўленка, адносілася да "паўзабароненых тэм"[1].

Такім чынам, вышэйшае саслоўе, якое адыгрывала важную ролю ў жыцці капіталістычнага грамадства Беларусі, па сутнасці ігнаравалася ў працах савецкіх гісторыкаў. І ў апошнія гады, нягледзячы на актывізацыю навукова-даследчай працы ў галіне забароненых раней тэм, гісторыя дваранства Беларусі перыяду капіталізму яшчэ не стала прадметам спецыяльнага даследавання. Гэта абмяжоўвае магчымасці асвятлення гісторыі беларускага грамадства ў парэформенны час у яе паўнаце, пераадолення аднабаковасці і схематызму ў выяўленні складаных працэсаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краю, фарміравання беларускай нацыі.

---

[1] Павленко Н.И. Летописцы Отечества // С.М. Соловьёв. Общедоступные чтения о русской истори. М., 1992. С. 20.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Да 1917 г. Расійская імперыя ў сацыяльна-юрыдычным плане захавала ўсе саслоўныя інстытуты, якія склаліся яшчэ ў феадальную эпоху. Падзел грамадства на саслоўі замацоўваў за кожным з іх пэўныя прывілеі і абавязкі. Асноўнымі саслоўямі ў імперыі былі дваране, праваслаўнае духавенства, ганаровыя грамадзяне, купцы, мяшчане і сяляне. Самым прывілеяваным з іх з'яўлялася дваранства.

Прынцып партыйна-класавага падыходу не дазволіў савецкім гісторыкам аб'ектыўна асвяціць ролю і месца вышэйшага саслоўя ў развіцці краіны. А між тым у Расійскай імперыі на працягу стагоддзяў прагрэс грамадства ў значнай ступені абумоўліваўся дзейнасцю гэтага саслоўя. У гістарычным даследаванні нельга пераносіць сучаснасць на мінулае. Гэта было значным недахопам савецкай гістарыяграфіі, якая ў сілу гэтага давала адназначна адмоўную ацэнку дваранству толькі таму, што яно было прывілеяваным саслоўем. Пры гэтым не надавалася ўвагі таму, што без наяўнасці такога саслоўя ў тагачасных расійскіх умовах грамадскі і культурны прагрэс быў бы амаль што немагчымы.

Саслоўная ўстойлівасць расійскага дваранства вызначалася не толькі падтрымкай яго з боку ўрада, але ў большай меры таму, што яно ніколі не было замкнутай кастай. Папаўненне дваранскага саслоўя на падставе спадчыннасці спалучалася з уваходжаннем у яго склад прадстаўнікоў іншых саслоўяў, якія дабіваліся пэўнага класа на ваеннай ці грамадзянскай службе ці мелі значныя заслугі перад дзяржавай. У гэтых умовах саслоўе папаўнялася не толькі колькасна, але і якасна.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі вышэйшае саслоўе краю было ўключана ў склад набілітэту імперыі. Разам з тым яно атрымала значна меншыя правы, якімі карысталася ў складзе Рэчы Паспалітай. Яго адносіны з царскім урадам насілі супярэчлівы характар. На працягу ўсяго перыяду дваранства Беларусі ў сваёй большасці не толькі заставалася ў апазіцыі да царызму, але і неаднаразова ўступала з ім у адкрытую ўзброеную барацьбу. А гэта прамое сведчанне таго, што дваранства не проста служыла самадзяржаўнай уладзе, але і клапацілася аб больш шырокіх дзяржаўных і народных інтарэсах. Таму абвінавачванні дваранства ў кансерватыўнасці (у прымяненні да перыяду капіталізму), прынамсі вышэйшага саслоўя Беларусі, не апраўдана.

Само па сабе вышэйшае саслоўе Расійскай імперыі юрыдычна было неаднародным. Яно падзялялася на дзве асноўныя страты — патомнае і асабовае. У сваю чаргу патомнае дваранства складалася з 6 разрадаў

у залежнасці ад спосабаў яго атрымання. У параўнанні з унутранымі губернямі імперыі ў Беларусі значная доля прыпадала на сапраўдных дваран (1-шы разрад) і старажытныя роды — 6-ты разрад. Да першага разраду адносіліся тыя, што даказалі сваю прыналежнасць да вышэйшага саслоўя. Вялікая ўдзельная вага сярод патомнага дваранства старажытных родаў тлумачыцца тым, што інстытут дваранства ў Рэчы Паспалітай склаўся значна раней, чым у Расіі.

Асабовае дваранства з'яўлялася адной з важнейшых крыніц папаўнення патомнага дваранства. Асабовыя дваране карысталіся значна меншымі прывілеямі ў параўнанні з патомнымі. Яны толькі фармальна ўваходзілі ў склад карпаратыўнай арганізацыі, не запісваліся ў дваранскія радаслоўныя кнігі, дваранства не перадавалася іх дзецям у спадчыну і г .д. У асноўным гэта былі чыноўнікі ці афіцэры ніжніх чыноў.

У адрозненне ад расійскіх губерняў у Беларусі было неістотным папаўненне патомнага дваранства за кошт асабовых з ліку мясцовых жыхароў. Гэта тлумачыцца тым, што для прадстаўнікоў рымска-каталіцкага веравызнання практычна забаранялася грамадзянская і ваенная служба ў краі.

У Беларусі ў адрозненне ад унутраных губерняў Расіі існавала і трэцяе падраздзяленне дваранства — "быўшая польская" шляхта. Звычайна гэта былі дробназямельныя ці абеззямеленыя асобы вышэйшага саслоўя Рэчы Паспалітай, якія юрыдычна не змаглі даказаць сваё высокае паходжанне. Практычна гэта катэгорыя прыпыніла сваё існаванне з 1865 г., але фактычна шляхта, як асобы сацыяльны феномен, не была ліквідавана.

На дынаміку колькаснага складу вышэйшага саслоўя Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. паўплывалі ўнутрыпалітычныя падзеі як у Паўночна-Заходнім краі, так і ў імперыі ўвогуле. Буржуазныя рэформы ў Расіі праводзіліся "зверху" і ў некаторай меры з улікам інтарэсаў дваранства. Але бессаслоўны характар рэформ значна звузіў кола прывілеяў дваранства. Яно вымушана было прыстасоўвацца да новых умоў жыцця. У сувязі з гэтым значная частка вышэйшага саслоўя цэнтральных губерняў Расіі сваі надзеі на будучыню па-ранейшаму звязвала з царскім урадам. Што тычыцца дваранства Беларусі, то яно ў сваёй большасці, асабліва рымска-каталіцкага веравызнання, успрыняло рэформы другой паловы XIX ст. і першую буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю як магчымасць адраджэння былой Рэчы Паспалітай. Гэта з'явілася асновай яго духоўнай стойкасці і прывязанасці да сваіх маёнткаў.

Паражэнне паўстання 1863 г. істотна паўплывала на колькасць па-

томных дваран у 5 заходніх губернях. З 1863 да 1867 г. яна паменшылася амаль напалову. Але ў наступным наглядаўся колькасны рост вышэйшага саслоўя. Ужо ў 1897 г. ён склаў 205 тыс. чал. супраць 121 тыс. чал. у 1867 г. Разам з тым яго доля ў складзе ўсяго насельніцтва краю паступова скарачалася. Адной з прычын гэтага была палітыка царызму па "разбору шляхты" і шырокамаштабныя рэпрэсіі ў дачыненні да дваранства рымска-каталіцкага веравызнання. Але, нягледзячы на гэтыя акцыі, працэнт патомных дваран у краі адносна ўсяго насельніцтва заставаўся высокім. Так, напрыканцы XIX ст. ён раўняўся 2,4 %, а ў Еўрапейскай Расіі — толькі 0,9 %. Аб здольнасці патомнага дваранства Беларусі прыстасавацца да новых умоў жыцця сведчыць факт павелічэння ў яго асяроддзі колькасці гарадскіх жыхароў. У 1858 г. яны складалі каля 10 %, а ў 1913 г. — каля 25 %.

Павелічэнне колькасці асабовых дваран у Беларусі ў азначаны перыяд меў тую адметную асаблівасць, што гэта адбывалася ў асноўным за кошт выхадцаў з расійскіх губерняў, а тэмпы прыросту саступалі агульнарасійскім паказчыкам больш чым у 2 разы. Да таго ж, пераважная большасць асабовых дваран і класных чыноўнікаў пражывала ў гарадах.

Аналіз якасных змяненняў у складзе вышэйшага саслоўя Беларусі перыяду капіталізму не дазваляе выявіць асноўныя заканамернасці працэсаў і іх сутнасць. Гэта тлумачыцца тым, што натуральны працэс унутрысаслоўнага руху пастаянна парушаўся дзеяннямі царскіх урадавых органаў у краі. Праяўленнем гэтага з'явіліся перш за ўсё шматлікія абмежаванні ў адносінах да мясцовых ураджэнцаў і падтрымка выхадцаў з расійскіх губерняў. У сувязі з гэтым не выпадае прызнаць натуральным, што ў Беларусі ў канцы XIX ст. мясцовыя ўраджэнцы сярод патомных дваран складалі каля 80 %, а сярод асабовых і класных чыноўнікаў і таго менш — 65 %. Ужо самім гэтым фактам уплыў дваранства на палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы ў краі штучна абмяжоўваўся.

Дваранства Беларусі, побач са святарамі, было самым адукаваным саслоўем. Гэта з'яўлялася важнай перадумовай здзяйснення ім вызначальнай ролі ў фарміраванні грамадскай думкі, развіцці культуры, вызначэнні нацыянальнага абрысу краю. Адносна высокая адукаванасць дваранства з'явілася вынікам прамой падтрымкі з боку царскага ўрада, за якой стаялі перш за ўсё яго палітычныя інтарэсы. Аднак вышэйшае саслоўе Беларусі каталіцкага веравызнання ў другой палове XIX ст. гэтай падтрымкі было пазбаўлена. Таму агульны паказчык адукацыйнага ўзроўню дваранства Беларусі на рубяжы XIX—XX стст. аказаўся ніжэйшым, чым у цэлым па Еўрапейскай Расіі. Гэта адмоўна паўплывала і на

складванне нацыянальнай інтэлігенцыі, якая магла б падняцца вышэй сваіх класавых інтарэсаў.

Дваранства Беларусі азначанага перыяду было неаднародным па канфесійнай прыналежнасці. Яно падзялялася на дзве асноўныя часткі — праваслаўную і каталіцкую. Царскі ўрад выкарыстаў гэта, каб перанесці яго і на нацыянальную глебу. Беларускае дваранства, незалежна ад яго пазіцыі, штучна падзялілі на рускіх і палякаў. Геапалітычнае становішча Беларусі з'яўлялася разменнай картай у міжнароднай палітыцы еўрапейскіх дзяржаў і Расіі. Таму беларускае дваранства каталіцкага веравызнання ў сваёй большасці рабіла стаўку на аднаўленне Польшчы ў межах 1772 г., а праваслаўная — прапагандавала ідэю "заходне-русізму". У сувязі з гэтым у асяроддзі беларускага дваранства толькі на пачатку XX ст. пачала фарміравацца краёвая ідэя — ідэя барацьбы за аднаўленне Вялікага княства Літоўскага.

У той жа час штучная ідэнтыфікацыя ўрадам канфесійнай і нацыянальнай прыналежнасці дваранства па прынцыпу: католік — значыць паляк, праваслаўны — рускі — стала прычынай скажэння колькасці дваран-беларусаў. Між тым у сельскай мясцовасці патомныя дваране-беларусы складалі большасць — 60,3 %. Сярод гарадскога вышэйшага саслоўя на долю беларусаў у канцы XIX ст. прыпадала толькі 13 %. Гэта азначае, што гарады, дзе праходзілі асноўныя працэсы фарміравання буржуазнай нацыі, у Беларусі аказаліся амаль што без нацыянальнага набілітэту.

Вышэйшае саслоўе ў перыяд капіталізму адыгрывала значную ролю ў эканоміцы Беларусі. Асноўным сродкам сельскагаспадарчай вытворчасці ў парэформенныя гады з'яўлялася зямля. У выніку скасавання прыгону яна фармальна станавілася аб'ектам свабоднай куплі-продажу.

Падводзячы вынікі аналізу эвалюцыі дваранскага землеўладання ў Беларусі неабходна адзначыць, што асноўныя працэсы, якія тут адбываліся, ў азначаны час, па свайму характару адпавядалі агульнарасійскім. У прыватнасці, у Беларусі, як і ўвогуле ў Расіі, наглядалася скарачэнне дваранскага і павелічэнне бессаслоўнага прыватнага землеўладання. Зямля ўсё больш станавілася аб'ектам куплі-продажу. Падала ўлада зямлі, павялічвалася ўлада грошай. Аднак у Беларусі гэты працэс у значнай ступені быў дэфармiраваны пад уздзеяннем палітыкі царызму ў краі. Увядзенне абмежавальных законаў адносна набыцця зямлі дваранамі рымска-каталіцкага веравызнання і яўрэямі штучна стрымлівала працэс яе мабілізацыі. Гэта значыць, што праблема землеўладання ў Паўночна-Заходнім краі з эканамічнай пераўтварылася ў палітычную. Галоўнай мэтай царызму з'яўлялася ўмацаванне тут сваіх пазіцый праз насаджэнне рускага землеўладання.

Урадавая пазямельная палітыка ў краі прывяла да таго, што аб'ектыўнае скарачэнне дваранскага землеўладання ў Беларусі адбывалася ў значна меншых памерах, чым у расійскіх губернях. Калі ў цэлым па Еўрапейскай Расіі з 1877 да 1905 г. дваране страцілі 27,2 % зямлі, дык у Беларусі — толькі 10,8 %. Відавочна, гэта было і адлюстраваннем таго, што памешчыкі краю больш паспяхова прыстасаваліся да новых капіталістычных адносін.

Зямельныя мабілізацыйныя працэсы ў Беларусі стрымліваліся таксама наяўнасцю вялікай колькасці маяратаў, сервітутаў, цераспалосіцы, неакрэсленых пазямельных адносін памешчыкаў з сялянамі і іншымі катэгорыямі земляробаў. Пераадоленне гэтых феадальных перажыткаў зацягнулася ў Беларусі на неапраўдана доўгі тэрмін, што стрымлівала развіццё капіталізму як у памешчыцкай, так і сялянскай гаспадарках.

Стварэнне Дваранскага пазямельнага банка і дзейнасць яго аддзяленняў у Беларусі не ўнесла істотных змяненняў у працэс пераразмеркавання дваранскага землеўладання, таму што банк абслугоўваў толькі дваран рускага паходжання. Разам з тым дзейнасць банка надала зямельным мабілізацыйным працэсам больш цывілізаваны, уласцівы буржуазнаму грамадству, характар.

У парэформенны перыяд традыцыйнай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці заставалася земляробства. У першыя два дзесяцігоддзі пасля скасавання прыгону дваранска-памешчыцкае земляробства ў Беларусі апынулася ў стане глыбокага крызісу. Гэта было выклікана як агульнымі наступствамі рэформы 1861 г., так і рэпрэсіўнай палітыкай царызму пасля паўстання 1863 г. у дачыненні да дваран рымска-каталіцкага веравызнання. Аднак з цягам часу, нягледзячы на адмоўнае ўздзеянне аграрнага крызісу 80—90—х гадоў, памешчыцкая гаспадарка паступова прыстасоўвалася да капіталістычных адносін. Праяўленыя большасцю дваран схільнасць і здольнасць да пераўтварэнняў у земляробстве на пачатках капіталізму сведчаць аб тым, што прычынамі захавання перажыткаў феадалізму ў парэформенны перыяд была не сама па сабе наяўнасць дваран-памешчыкаў, а перш за ўсё існаваўшая ў той час самадзяржаўная сістэма ўлады.

Дваране Беларусі ў цэлым паспяхова адказалі на выклік часу. Для іх уласцівай была ўспрымальнасць да навін у агратэхніцы і агрыкультуры. Хаця ў савецкай гістарыяграфіі было прынята лічыць, што дваране вымушаны былі пераходзіць да прымянення сельскагаспадарчых машын і новай тэхнікі з-за звужэння магчымасцей выкарыстання імі сялянскай працы, на самай жа справе ўсё было не так адназначна. Не будзе перабольшваннем, калі скажам, што значная частка дваран, а

латыфундысты і ўвогуле ўсе, у сваёй землеробчай дзейнасці арыянталіся перш за ўсё на перадавы вопыт заходніх краін. Мэта — падняць даходнасць сваіх гаспадарак, а не проста эканамічна выжыць. Таму для канца XIX — пачатку XX ст. для дваранска-памешчыцкіх эканомій было характэрна не толькі прымяненне новай сельскагаспадарчай тэхнікі, але і ўвядзенне шматпольных севазваротаў, пераход на вырошчванне пераважна тэхнічных культур, травасеянне і г.д.

Важнай галіной дваранска-памешчыцкай сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўлялася жывёлагадоўля. Вынікі даследвання паказваюць, што жывёлагадоўля ў другой палове XIX — пачатку XX ст. наўпрост была звязана з капіталістычнымі пераўтварэннямі ў сельскай гаспадарцы. Памешчыкі Беларусі паступова пераходзілі ад экстэнсіўнай да інтэнсіўнай жывёлагадоўлі. Яны не проста павялічвалі колькасць жывёлы ў сваіх гаспадарках, але і актыўна займаліся развядзеннем палепшаных яе парод.

У прыватнасці, у конегадоўлі памешчыкі стварылі значную колькасць конных заводаў, праз якія забяспечвалі патрэбнасці краю ў палепшаных, пераважна замежных, пародах коней. Гэта дало магчымасць удасканаліць і якасць мясцовых парод коней. Іх выкарыстоўвалі ў якасці цяглавай сілы для новых сельскагаспадарчых машын і механізмаў.

Значны ўклад памешчыцкія гаспадаркі Беларусі ўнеслі і ў павелічэнне колькасці і паляпшэнне якасных характарыстык буйной рагатай жывёлы. З 1856 да 1911 г. яе колькасць павялічылася больш як у два разы. З канца XIX ст. у некаторых памешчыцкіх гаспадарках назіралася актыўная селекцыйная работа па паляпшэнню беларуска-літоўскай пароды кароў праз скрэшчванне з лепшымі замежнымі пародамі. У выніку павялічыліся як вага жывёлы, так і выхад малака.

Сведчаннем прыстасавання памешчыцкай буйнарагатай жывёлагадоўлі да рыначнай эканомікі з'явілася набыццё ёю гандлёва-прадпрымальніцкага характару. У эканоміях ствараліся адкормачныя пункты, чаму ў значнай ступені садзейнічала і наяўнасць значнай колькасці броварaў. З 80-х гадоў у памешчыцкіх гаспадарках даволі высокімі тэмпамі пачала развівацца і малочна-таварная жывёлагадоўля. Гэта патрабавала забеспячэння яе высокім навуковым і практычным вопытам. Таму актыўна праводзілася селекцыйная работа, ствараліся міжгаспадарчыя кантрольныя саюзы. У сваю чаргу сельскагаспадарчыя таварыствы, членамі якіх у асноўным былі памешчыкі, арганізавалі школы і курсы па падрыхтоўцы спецыялістаў малочнай вытворчасці. Для перапрацоўкі малочнай прадукцыі засноўваліся масларобчыя і сыраварныя заводы.

Арыентацыя на мяса-малочную вытворчасць спрыяла павышэнню таварнасці сельскай гаспадаркі, пашырэнню яе інтэнсіфікацыі і спе-

цыялізацыі, далейшаму развіццю ўнутранага і знешняга гандлю.

Усё гэта сведчанне таго, што дваранска-памешчыцкая сельская гаспадарка ў Беларусі, і перш за ўсё яе жывёлагадоўчая галіна, даволі паспяхова пераводзілася на рынычныя рэйкі. У сваю чаргу, частка памешчыкаў, якая не здолела гэта ажыццявіць, выбывала з сферы сельскагаспадарчай вытворчасці і страчвала зямельную ўласнасць. Гэта абвяргае ленінскую канцэпцыю аб рэакцыйнасці памешчыцкай гаспадаркі як носьбіта перажытачных форм гаспадарання ў другой палове XIX — пачатку XX ст. і неабходнасці яе ліквідацыі для забеспячэння прагрэсу сельскагаспадарчай вытворчасці. Якраз наадварот, менавіта на базе перадавых памешчыцкіх гаспадарак у савецкія часы засноўваліся першыя камуны і кааператывы. Таму разбурэнне памешчыцкіх эканомій з'явілася крокам не наперад, а назад.

Адным з важных накірункаў гаспадарчай дзейнасці дваран (у першую чаргу зямельных) было прамысловае прадпрымальніцтва, гандаль лесам і лесаматэрыяламі. Гэта сфера дзейнасці ў парэформенны перыяд з'явілася адлюстраваннем агульнага працэсу пераўтварэння ўсёй дваранскай гаспадаркі на рыначных пачатках. Пасля скасавання прыгону прамысловасць працягвала называцца дваранскай толькі па форме. Што тычыцца яе вытворча-эканамічнага зместу, то яна амаль ва ўсім адпавядала рыначным патрабаванням. Гэта азначае, што ад феадальнага мінулага ў арганізацыі і функцыяванні дваранскай прамысловасці ўвогуле нічога не засталося, а сама яна пераўтварылася ў капіталістычную. І гэта неабвержнае сведчанне таго, што дваранства ў парэформенны перыяд не з'яўлялася натуральным праціўнікам новага, буржуазнага ладу.

Разам з тым ва ўмовах захавання буйнамаштабнага дваранскага землеўладання парушаўся прынцып роўнасці ўмоў буржуазнай канкурэнцыі ў прамысловай дзейнасці. Калі для новай буржуазіі сыравіна для прамысловасці з'яўлялася таварам, дык дваране ў шматлікіх выпадках з'яўляліся яе ўласнікамі. У сувязі з гэтым існуе палажэнне, што абмежаванасць вольнай канкурэнцыі і няроўнасць умоў доступу да крыніц сыравіны тармазілі развіццё буржуазнай прамысловасці. Гэта так толькі таму, што большасць памешчыцкіх прадпрыемстваў у першыя дзесяцігоддзі пасля скасавання прыгону працавалі на мясцовай сыравіне. Але паступова ствараліся прадпрыемствы, якія працавалі і на экспартнай сыравіне. Гэта шоўкапрадзільная, баваўняная, хрустальная, машынабудаўнічая і іншыя галіны.

Аналіз прамыслова-прадпрымальніцкай дзейнасці дваранства Беларусі паказвае, што колькасць дваранскіх мануфактур, фабрык і заводаў у другой палове XIX—пачатку XX ст. нераўнамерна, але няўхільна па-

вялічвалася. Прамысловы пераварот закрануў практычна ўсе галіны дваранскай прамысловасці. Машынная тэхніка і новыя тэхналогіі спрыялі пашырэнню выпуску прадукцыі, фарміраваўся новы клас буржуазнага грамадства — фабрычна-завадскі пралетарыят. Сам жа дваранін-прамысловец станавіўся прамысловым буржуа.

"Даравальная грамата" 1785 г. задаволіла большасць вышэйшага саслоўя таму, што яна адпавядала яго поглядам на волю і свабоду. Акрамя волі, дваранства атрымала права ствараць у кожным павеце і губерні дваранскія таварыствы і рэгулярна праводзіць дваранскія сходы. Яшчэ да рэформ 1860-х гадоў кожнае дваранскае таварыства ўяўляла сабой пэўны элемент грамадзянскай супольнасці. Таварыствы з'яўляліся аўтаномным ад улады згуртаваннем вольных грамадзян з сваёй арганізацыяй, праз якую яны маглі ўплываць нават на палітыку ўрада. Палітычныя падзеі пачатку 1860-х гадоў у Паўночна-Заходнім краі прывялі да ліквідацыі выбарных органаў дваранскага самакіравання, а гэта значыць — зачаткаў парламентарызму, няхай сабе і саслоўнага. На працягу ўсяго разглядаемага перыяду палітыка царызму ў адносінах да дваранскага карпаратыўнага самакіравання ў краі характарызавалася непаслядоўнасцю тактычных прыёмаў. Разам з тым генеральная лінія вытрымлівалася цвёрда і ўпэўнена. Яна была скіравана на аслабленне сепаратызму вышэйшага саслоўя рымска-каталіцкага веравызнання.

Гэта палітыка наглядна праявілася і ў адносінах да замяшчэння дваранамі пасад на дзяржаўнай службе ў краі. У якасці чыноўнікаў у Беларусі служылі выхадцы з цэнтральных губерняў імперыі. Асабліва гэта тычылася вышэйшых пасад і органаў кіравання, якія непасрэдна абслугоўвалі інтарэсы мясцовага насельніцтва. Беларускае дваранства, звычайна рымска-каталіцкага веравызнання, не дапускалася да дзяржаўнай службы ў краі. Яно магло рэалізоўваць свае здольнасці толькі за межамі Беларусі. У сувязі з гэтым палітыка царскага ўрада прывяла да таго, што ў асяроддзі чыноўніцтва не склалася нацыянальная служылая інтэлігенцыя як носьбіт нацыянальна-дзяржаўнай ідэі.

З усяго сказанага вынікае, што прыстасаванне дваранства да ўмоў і патрабаванняў буржуазнага грамадства ў другой палове XIX — пачатку XX ст. адбывалася як у эканамічнай, так і сацыяльнай сферах. У Беларусі гэта паскаралася і асобай палітыкай царскага ўрада ў дачыненні да дваран-католікаў, якія складалі ў краі большасць саслоўя. Пад уздзеяннем гэтых працэсаў ад былога феадальнага аблічча, за выключэннем некаторых прывілеяў вышэйшага саслоўя рускага паходжання, у дваран ужо ў пачатку XX ст. амаль нічога не засталося. Гэта азначае, што яны станавіліся складовай часткай класавага буржуазнага грамадства.

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

## Табліца расійскіх чыноў

| Грамадзянскія | Ваенныя | Марскія |
|---|---|---|
| **Высокаправасхадзіцельствы** | | |
| 1. Дзяржаўны канцлер | 1. Генерал-фельдмаршал | 1. Генерал-адмірал |
| 2. Правадзейны тайны саветнік | 2. Генерал | 2. Адмірал |
| **Прыдворныя чыны: обер-камергер, обер-гофмайстар, обер-гофмаршал, обер-шэнк** | | |
| **Правасхадзіцельствы** | | |
| 3. Тайны саветнік | 3. Генерал-лейтенант | 3. Віцэ-адмірал |
| 4. Правадзейны стацкі саветнік | 4. Генерал-маёр | 4. Контр-адмірал |
| **Прыдворныя чыны: камергер, гофмайстар, гофмаршал, егермайстар** | | |
| **Высакароддзе** | | |
| 5. Стацкі саветнік | 5. - | 5. - |
| | **Высокаблагароддзе** | |
| 6. Калежскі саветнік | 6. Палкоўнік | 6. Капітан 1 рангу |
| 7. Надворны саветнік | 7. Падпалкоўнік | 7. Капітан 2 рангу |
| 8. Калежскі асэсар | 8. Капітан (у пяхоце) альбо ротмістр (у кавалерыі) | 8. - |
| **Благароддзе** | | |
| 9. Тытулярны саветнік | 9. Штабс-капітан альбо штабс-ротмістр | 9. Лейтэнант |
| 10. Калежскі сакратар | 10. Паручык | 10. Мічман |
| 11. - | 11. - | 11. - |
| 12. Губернскі сакратар | 12. Падпаручык | 12. - |
| 13. - | 13. Прапаршчык | 13. - |
| 14. Калежскі сакратар | 14. - | 14. - |

## Тытулаваныя землеўласнікі Беларусі[1]

| № п/п | Тытул, прозвішча | Колькасць зямлі (дзес.) | Паветы, маёнткі |
|---|---|---|---|
| 1. | Барон Альфтан А.Г. | 33887 | Слуцкі п.: м. Гаўрыльчыцы, м. Мілкавічы, м. Ражан, м. Старобін, м. Яскевічы; Брэсцкі п.: м. Кавердакі |
| 2. | Граф Апраксін М.А. | 3588 | Гарадоцкі п.: м. Сарывонская Рудня |
| 3. | Графіня Бабрынская П.А. | 15337 | Кобрынскі п.: м. Дошнік, м. Дзятлавічы, м. Бялін |
| 4. | Баранэса Брунова Я.Л, | 1303 | Гродзенскі п.: м. Рудова, м. Галынка |
| 5. | Княгіня Вяземская М.У. і графіня Левашова К.У. | 25729, з іх – у Падольскай губ.– 7137 дзес., С.-Пецярбургскай губ.– 9621 дзес. | Гродзенскі п.: м. Азёры |
| 6. | Княгіня Гогенлоэ М.Л. | 6797 | Навагрудскі п.: м. Любча |
| 7. | Князь Галіцын С.А. | 1154 | Вілейскі п.: м. Шантараўшчызна |
| 8. | Графіня Грабоўская Я.К. | 7199 | Аршанскі п.: м. Катышын, м. Ляснічае |
| 9. | Граф Грабоўскі К. | 15274 | Ігумескі п.: м. Сямёнавічы, м. Таўкачэвічы |
| 10. | Граф Грабоўскі М.С. | 1826 | Брэсцкі п.: м. Дамянчыцы, м. Турна |
| 11. | Граф Грабоўскі С.Р. | 5387 | Лідскі п.: м. Мажэйкаў-Вялікі |
| 12. | Княгіня Даўгарукава С.І. | 3298 | Навагрудскі п.: м. Балаванавічы, м. Мышляны, м. Бянін |
| 13. | Князь Дандукоў-Корсакаў У.М. | 17954 з іх 12349 дзес. у С.-Пецярбург. губ. | Горацкі п.: м. Раманава |
| 14. | Князь Друцкі-Любецкі У.А. | 10614 | Кобрынскі п.: м. Ляхавічы; Пінскі п.: м. Пагост |
| 15. | Князь Друцкі-Любецкі Э.І. | 51556 | Пінскі п.: м. Багданава, м. Лунін |
| 16. | Граф Замойскі З.А. | 836 | Брэсцкі п.: м. Мінькавічы |
| 17. | Граф Замойскі А.І. | 6000 | Брэсцкі п.: м. Прыборава |
| 18. | Графіня Зубава А.В. | 1193 | Аршанскі п.: м. Лешна |
| 19. | Графы Зубавы (5 чал.) | 33680 | Рэчыцкі п.: м. Гарвор, м. Свідзера |
| 20. | Вялікія князі Раманавы Мікалай і Пётр Мікалаевічы | 151281 | Барысаўскі п.: м. Стары Барысаў |
| 21. | Графіня Клейнміхель В.У. | 1702 | Пружанскі п.: м. Пружаны |

[1] Падлічана: Вся Россия. Русская книга промышленности, торговли, сельского хозяйства и администраци. СПб., 1900. Т. 2. Отд. V. С. 163-352.

| № п/п | Тытул, прозвішча | Колькасць зямлі (дзес.) | Паветы, маёнткі |
|---|---|---|---|
| 22. | Граф Корвін-Мілеўскі І.А. | 2755 | Ашмянскі п.: м. Геранены |
| 23. | Барон Корф В.В. | 2635 | Горацкі п: м. Якаўлевічы |
| 24. | Барон Корф К.М. | 882 | Брэсцкі п.: м. Трасцяніца |
| 25. | Барон Корф М.А. | 619 | Брэсцкі п.: м. Трасцяніца |
| 26. | Графіні Касакоўская М. І Даўгяла А. | 27790 | Мозырскі п.: м. Петрыкаў |
| 27. | Граф Касакоўскі С.С. | 8777, з іх 4582 дзес. у Гродзенскім п. і 4195 дзес. у Сімбірскай губ. | Гродзенскі п.: м. Вялікая Бераставіца |
| 28. | Княгіня Крапоткіна М.А. | 5129 | Чэрыкаўскі п.: м. Старшыка, м. Ельня |
| 29. | Князь Крапоткін К.С. | 11980 | Мозырскі п.: м. Камаровічы |
| 30. | Графіня Красінская М.І. | 38337 | Ігуменскі п.: м. Жарноўка, м. Кухцічы, м. Уздзянка, м. Зосін |
| 31. | Графіня Красінская М.В. | 1297 | Гродзенскі п.: м. Свислач, м. Вандалінава, м. Красоўка |
| 32. | Графіня Красіцкая М.І. | 1600 | Слонімскі п.: м. Скорава |
| 33. | Граф Красіцкі А.М. | 2149 | Пінскі п.: м. Красічын |
| 34. | Княгіня Кудашова В.М. | 8060 | Рэчыцкі п.: м. Холмеч |
| 35. | Графіня Левашова В.В. | 8795 | Гродзенскі п.: м. Азёры |
| 36. | Князь Любамірскі Я.Я. | 21502 | Аршанскі п.: м. Багушоўка, м. Галашоўка, м. Гуркаўшчызна, м. Забор'е, м. Сайшчына, м. Тухінь |
| 37. | Графіня Маўрас С.І. | 1617 | Слонімскі п.: м. Жукаўшчызна |
| 38. | Баранэса Майендорф Я.П. | 8558, з іх у Тульскай губ.– 2399 дзес. | Дрысенскі п.: м. Каменка |
| 39. | Князь Мяшчэрскі М.М. | 1681 | Клімавічскі п.: м. Мілаславічы |
| 40. | Князь Мяшчэрскі С.М. | 4781 | Клімавічскі п.: м. Янаполь |
| 41. | Барон Марэнгейм А.П. | 792 | Брэсцкі п.: м. Горкі |
| 42. | Баранэса Нолькен С.М. | 860 | Гродзенскі п.: м. Крынкі |
| 43. | Княгіня Абаленская А.П. | 1705 | Мсціслаўскі п.: м. Петраланд |
| 44. | Князь Абаленскі А.А. | 5853 | Клімавічскі п.: м. Хоцімск |
| 45. | Я.І.В. прынц Альдэнбургскі К.П. | 27000 | Слонімскі п.: м. Мерачаўшчызна |
| 46. | Граф О'Рурк А. | 8231 | Навагрудскі п.: м. Усялюб |
| 47. | Графіні О'Рурк Ганна і Элеанора | 1825 | Навагрудскі п.: м. Бардзячы |
| 48. | Граф О'Рурк М. | 1373 | Навагрудскі п.: м. Басін |
| 49. | Граф Плятэр | 1482 | Слуцкі п.: м. Вусава |
| 50. | Графіня Патоцкая М.К. | 3100 | Брэсцкі п.: м. Высока-Літоўск |
| 51. | Графіня Патоцкая М.С. і Астроўская Э.С. | 13721 | Бабруйскі п.: м. Гонча, м. Свіслач; Навагрудскі п.: м. Сваротва |
| 52. | Граф Патоцкі К.К. | 137336 | Слонімскі п.: м. Быцень; |

| № п/п | Тытул, прозвішча | Колькасць зямлі (дзес.) | Паветы, маёнткі |
|---|---|---|---|
| | | | Навагрудскі п.: м. Ржэпіхава; Пінскі п.: м. Маўковічы, м. Радзялавічы, м. Хатынічы |
| 53. | Граф Патоцкі М. і барон фон-Вульф Э. | 72092 | Ігуменскі п.: м. Бярэзіна-Любашанская |
| 54. | Граф Патоцкі С.Г. | 8400 | Ваўкавыскі п.: м. Рось, м. Шніпава |
| 55. | Графіня Пуслоўская М.Ф. | 2000 | Брэсцкі п.: м. Сушкі |
| 56. | Графіня Пуслоўская Я.І. | 2000 | Гродзенскі п.: м. Зарубічы |
| 57. | Граф Пуслоўскі У.Ф. | 1200 | Слонімскі п.: м. Пяскі |
| 58. | Граф Пуслоўскі Ф.У. | 92066 | Слонімскі п.: м. Альберцін, м. Плянта, м. Целеханы |
| 59. | Граф Путкамер Л.С. | 3376 | Навагрудскі п.: м. Карэлічы |
| 60. | Граф Путкамер С.Л. | 1058 | Лідскі п.: м. Бальцанікі, м. Бражэльцы |
| 61. | Граф Путкамер І.С. | 2832 | Навагрудскі п.: м. Карэлічы, м. Беразавец |
| 62. | Князь Радзівіл А.В. | 114488 | Мінскі п.: м. Стары і Новы Свержань; Мозырскі п.: м. Юзафін, м. Бярозава, м. Гліннае; Слуцкі п.: м. Быстрыца, м. Варшаўка, м. Грэск, м. Дзяніскавічы, м. Дыямполь, м. Малева, м. Нясвіжскае лясніцтва, м. Радзіваламонты, м. Цімкавічы, м. Цэпра, м. Чудзін; Пінскі п.: м. Манькавічы; Навагрудскі п.: м. Сталовічы. |
| 63. | Князь Радзівіл І.Я. | 3085 | Ігуменскі п.: м. Анопаль |
| 64. | Княгіні Радзівіл М. спадчынікі | 2500 | Слонімскі п.: м. Дварэц |
| 65. | Князь Радзівіл М.К. | 2005 | Навагрудскі п.: м. Паланечна |
| 66. | Графіня Развадоўская Е.А. | 384 | Слуцкі п.: м. Валькаўшчызна |
| 67. | Графіня Развадоўская М.П. | 768 | Кобрынскі п.: м. Брано |
| 68. | Барон Рутэнберг К.А. | 730 | Аршанскі п.: м. Крынкі |
| 69. | Князь Святаполк-Завадскі | 1883 | Навагрудскі п.: м. Крошын |
| 70. | Князь Святаполк-Мірскі М.І. | 10785 | Навагрудскі п.: м. Гарадзея |
| 71. | Князь Святаполк-Чацвярцінскі С.К. | 2000 | Гродзенскі п.: м. Скідзель |
| 72. | Графіня Сіmоніч Е.Д. | 1843 | Лідскі п.: м. Вялікая Лебяда |
| 73. | Граф Слізень Г. | 12411 | Барысаўскі п.: м. Дзядзілавічы |
| 74. | Граф Солтан А. | 369 | Гродзенскі п.: м. Каменная Берастaвіца |
| 75. | Граф Тышкевіч В.М. | 12266 | Мінскі п.. м. Першаі, м. Доры |
| 76. | Граф Тышкевіч І. | 3534 | Барысаўскі п.: м. Камень |
| 77. | Граф Тышкевіч І.М. | 8705 | Барысаўскі п.: м. Косін |

| № п/п | Тытул, прозвішча | Колькасць зямлі (дзес.) | Паветы, маёнткі |
|---|---|---|---|
| 78. | Граф Тышкевіч І.М. | 10621 | Мінскі п.: м. Макржымаўшчызна, м. Астрашыцкі Гарадок |
| 79. | Граф Тышкевіч І.І. | 13826, з іх 4192 у Віленскай губ. | Вілейскі п.: м. Ізабелін, м. Рагозін |
| 80. | Граф Тышкевіч І.А. | 19704 | Барысаўскі п.: м. Антанопаль, м. Лагойск |
| 81. | Граф Тышкевіч М.І. | няма дадзеных | Ашмянскі п.: м. Валожын |
| 82. | Графіня Тышкевіч С.А. | 10662 | Мозырскі п.: м. Паўлінава-Снядынь |
| 83. | Граф Тышкевіч Ф.І. | 87887 | Мозырскі п.: м. Всокае, м. Лельчыцы, м. Асавец, м. Астражанка |
| 84. | Граф Храптовіч-Буцянёў К.А. | 18669, з іх 1695 дзес. у Тульскай губ. | Лепельскі п.: м. Бешанковічы; Сенненскі п.: м. Лугіновічы, м. Ганковічы |
| 85. | Граф Храптовіч М.І. | 8685 | Навагрудскі п.: м. Шчорсы |
| 86. | Графіня Храптовіч-Буцянёва М.А. | 19276 | Ашмянскі п.: м. Вішнёва, м. Славянскі, м. Бярэзіна |
| 87. | Граф Чапскі А.А. | 1540 | Навагрудскі п.: м. Наруцэвічы |
| 88. | Граф Чапскі А.С. | 7067 | Слуцкі п.: м. Ганцавічы, м. Кукава |
| 89. | Граф Чапскі Г.Э. | 12622 | Ігуменскі п.: м. Самуэлева; Мінскі п.: м. Каралёва, м. Куль, м. Парылукі |
| 90. | Граф Чапскі К.Э. | 18994 | Мінскі п.: м. Негарэлае. М. Прусінава, м. Станькава |
| 91. | Граф Чапскі Э. | 720 | Навагрудскі п.: м. Сваяцічы |
| 92. | Граф Чарнышоў-Круглікаў | 1360 | Рагачоўскі п.: м. Жлобін |
| 93. | Барон Эльснер Э.В. | 719 | Аршанскі п.: м. Чорнаруччa |
| 94. | Барон Энгельгардт Э.Э. | 2434 | Кобрынскі п.: м. Булькава |
| Усяго зямлі | | 1313795 | |